# [З. Жылуновіч і Т. Глыбоцкі як крытыкі „Узвышша“]

1. Ад часу заснаваньня „Узв[ышша]“ пад відам крытыкі „Узв[ышша]“ некаторыя асобы, прыкрываючыся псэўдонімамі, увесь час выступаюць у друку з мэтаю прадставіць „Узвышша“ перад чытачом як зьяву адмоўную ў разьвіцьці бел[арускай] пасьлякастр[ычніцкай] літаратуры. Аб гэтым яскрава сьведчаць тыя прыёмы, якімі карыстаюцца гэтыя асобы для ажыцьцяўленьня гэтай мэты. *Пасьля выхаду 1 нум[ару] „Узв[ышша]“* у 1927 г. у Інбелк[ульце] два дні адбывалася дыскусія аб першым нумары. Пасьля яе нехта С. Друк зьмясьціў у „Сав[ецкай] Бел[арусі]“ артык[ул] „Скуткі двухдн[ёвай] дыск[усіі]“, у якім знарок перакруціў усе факты дзеля таго, каб давесьці, што „Узвышша“ — шкодная арганізацыя. Гэта згуртаван[ьне] выявіла ў сваім паведам[леньні] (гл. „Узв[ышша]“, № 2), на якое С. Д[рук] не знайшоўся нічога адказаць, як толькі абазваць узв[ышэнцаў] хлапчукамі. Аб тым № 1 З. Жыл[уновіч] у „Сав[ецкай] Бел[арусі]“ зьмясьціў арт[ыкул] «Ці сапр[аўды] „Узв[ышша]“ ёсьць узвыш[ша]», у якім з тою–ж мэтаю разглядвае „Узвыш[ша]“ і тэндэнцыйна асьвятл[яе] яго матар’ялы, паўтарае С. Друка. Ён піша, што кірун[ак] быў вядом[ы], бо ў „Узв[ышша]“ уваходз[яць] вядомыя Майсеі, што „Узв[ышша]“ — гэта масонская ложа, нічым гэтага не сьцьвярджаючы. Пасьля выхаду 2 нума[ру] піша ўжо нехта Глыбоцкі, які зьявіўся разам з арганізац[ыяй] „Узвыш[ша]“. Ён з мэтаю давесьці, што ў „Узв[ышша]“ толькі шыльда прол[етарская], а сутнасьць не пролетарс[кая], ён адзначае, што **яго погл[яды]** на орг[анізацыйныя] пл[яны] „Узв[ышша]“ **пацьвердж[аны]** у арт[ыкулах] З. Ж[ылуновіча] і С. Д[рука], і з свайго боку выдумвае факты для довадаў выст[аўленага] палажэньня. Ён гаворыць як аўтарытэт: „мы дазволім сабе“, „мы будзем гаварыць“, „мы–б сказалі“, „нам думаецца“, „мы параілі б“, „мы мусім пацьвердзіць“, „мы высоўвалі“ і г. д. і выдумвае і ізлагае факты: 1) не друкаваліся, 2) ухіляюц[ца] ад дыскусіі, 3) зьбіраюц[ца] фармаваць дыял[ектычна]—мат[ар’ялістычны] сьветагл[яд]. Пасьля трэцяга № выступае зноў З. Жыл[уновіч] з артыкул[ам] „Шкоднае ў [беларускай] літ[аратуры]“, у якім стараецца „изобраз[ить]“ справу так, што прычын[аю] шкодн[ага] зьяўляец[ца] існаваньне „Узвышша“. Дзеля гэтага ён вытаск[івае] з архіву факты, што мелі месца ў „Маладняку“ і, апраўд[ваючы] Чар[отаву] гр[амаду], усю віну звальва[е] на ўзвышаўцаў. Пра 4 нум[ар] піша зноў Глыбоцкі, стар[аючыся] давесьці, што „Узв[ышша]“ — сэкта. Пра 5 нумар піша зноў той жа Глыбоцкі, апрача таго, зьяўл[яюцца] артыкулы Сянк[евіча], Вара, Глыбоц[кага] з поваду асобных матар’ялаў у гэтым і ранейшым нумарох.

*[1928]*